| | |
|---|---|
| Упраўленне адукацыі<br>Слонімскага райвыканкама | Управление образования<br>Слонимского райисполкома |
| Дзяржаўная<br>ўстанова адукацыі<br>“Міжэвіцкая сярэдняя школа<br>Слонімскага раёна” | Государственное<br>учреждение образования<br>«Мижевичская средняя школа<br>Слонимского района» |
| ЗАГАД | ПРИКАЗ |

________________ № ______

Аб правядзенні першага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах у 2025/2026 навучальным годзе

У адпаведнасці з Інструкцыяй аб рэспубліканскай алімпіядзе па вучэбных прадметах, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20 лістапада 2003 г. № 73 (у рэдакцыі пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2024 г. № 107), на падставе загада ўпраўлення адукацыі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта (далей – упраўленне адукацыі) ад 12 верасня 2025 г. № 302 “Аб правядзенні першага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах у 2025/2026 навучальным годзе”, з мэтай павышэння матывацыі да вывучэння вучэбных прадметаў ва ўстанове адукацыі, выяўлення найбольш матываваных і здольных вучняў
ЗАГАДВАЮ:

1. Зацвердзіць:

1.1. Палажэнне аб першым этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах вучняў дзяржаўнай установы адукацыі “Міжэвіцкая сярэдняя школа Слонімскага раёна” (далей – Палажэнне) (дадаецца);

1.2. парадак правядзення першага этапу алімпіяды па кожным прадмеце;

1.3. склад прадметных аргкамітэтаў і журы (дадаецца);

1.4. спіс удзельнікаў першага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах (дадаецца).

2. Намесніку дырэктара па асноўнай дзейнасці Мялешка С.В.:

2.1. арганізаваць з мэтай падрыхтоўкі вучняў да рэспубліканскай алімпіяды іх удзел у навучальных зменах у дыстанцыйнай форме па вучэбных прадметах “Матэматыка”, “Фізіка”, “Хімія”, “Біялогія”, “Інфарматыка”, “Астраномія”, “Геаграфія”, якія праводзяцца дзяржаўнай установай адукацыі “Акадэмія адукацыі”, у наступныя перыяды:

з 22 па 28 верасня 2025 г.;

з 13 па 19 кастрычніка 2025 г.;

з 15 па 21 снежня 2025 г.;

з 2 па 8 лютага 2026 г.;

з 16 па 22 лютага 2026 г.;

з 6 па 12 красавіка 2026 г.;

з 20 па 26 красавіка 2026 г.

Інфармацыя размешчана на нацыянальным адукацыйным партале adu.by у тэматычным раздзеле “Школа алімпіяднага руху”;

2.2. арганізаваць і правесці першы этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах у адпаведнасці з Палажэннем аб першым этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах вучняў дзяржаўнай установы адукацыі “Міжэвіцкая сярэдняя школа Слонімскага раёна”, зацверджаным п.1.1. дадзенага загаду;

2.3. азнаёміць да 19 верасня 2025 г. з Парадкам правядзення першага этапу алімпіяды па кожным прадмеце ўсіх удзельнікаў дадзенага этапу рэспубліканскай алімпіяды;

2.4. забяспечыць своечасовае атрыманне і канфідэнцыяльнасць тыражыравання алімпіядных заданняў;

2.5. арганізаваць правядзенне ўсіх тураў першага этапу алімпіяды па адзіных тэкстах і ў адзіныя дні (п.2.1. загаду ўпраўлення адукацыі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта ад 12 верасня 2025 г. № 302 “Аб правядзенні першага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах у 2025/2026 навучальным годзе”) (дадатак 1) па вучэбных прадметах:

“Хімія”, “Біялогія”, “Геаграфія”, “Фізіка”, “Беларуская мова”, “Беларуская літаратура”, “Руская мова”, “Руская літаратура” – для вучняў 9, 10, 11 класаў;

“Гісторыя Беларусі”, “Сусветная гісторыя”, “Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі”, “Грамадазнаўства”, “Англійская мова”, “Нямецкая мова” – для вучняў 10, 11 класаў;

“Матэматыка” – для вучняў 8, 9, 10 і 11 класаў;

“Інфарматыка”, “Астраномія”, “Працоўнае навучанне”, “Фізічная культура і здароўе” – для вучняў 5 – 11 класаў.

2.6. прадаставіць ва ўпраўленне адукацыі райвыканкама:

2.6.1. куратарам вучэбных прадметаў пратаколы першага этапу алімпіяды (у электронным выглядзе) на працягу трох дзён пасля правядзення школьнай алімпіяды;

2.6.2. галоўнаму спецыялісту аддзела агульнай сярэдняй і дашкольнай адукацыі ўпраўлення адукацыі райвыканкама Жыліч В.М. да 24 кастрычніка 2025 г. справаздачы аб правядзенні першага этапу алімпіяды ў адпаведнасці з дадаткам 2 да загаду ўпраўлення адукацыі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта ад 12 верасня 2025 г. № 302 у папяровым выглядзе, пратаколы па кожным вучэбным прадмеце ў папяровым выглядзе, заяўкі на ўдзел каманд вучняў установы адукацыі ў другім этапе рэспубліканскай алімпіяды (дадатак 3 да загаду ўпраўлення адукацыі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта ад 12 верасня 2025 г. № 302) у адпаведнасці са спісамі (п.3.2. загаду ўпраўлення адукацыі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта ад 12 верасня 2025 г. № 302);

2.7. ажыццявіць да 27 кастрычніка 2025 г. рэгістрацыю ўдзельнікаў другога (раённага) этапу алімпіяды на сайце ўпраўлення адукацыі райвыканкама ў раздзеле “Алімпіяды”;

2.8. прааналізаваць вынікі ўдзелу вучняў у першым і другім этапах рэспубліканскай алімпіяды па ўсіх вучэбных прадметах, падрыхтаваць інфармацыю на нараду пры дырэктару ў лістападзе 2025 года.

3. Педагагічным работнікам, якія выконваюць функцыі класнага кіраўніка, Адамчык А.А., Мароз Т.І., Пілясавай І.У., Саўко І.І. інфармаваць вучняў і іх законных прадстаўнікоў аб магчымых інтэлектуальных і псіхалагічных нагрузках, звязаных з удзелам у алімпіядзе па некалькіх вучэбных прадметах.

4. Настаўнікам-прадметнікам Бакунову В.С., Саўко П.І. забяспечыць:

4.1. выкананне правіл тэхнікі бяспекі у час правядзення практычнага тура першага этапу алімпіяды па працоўным навучанні, фізічнай культуры і здароўю;

4.2. вучэбную майстэрню, спартыўную залу матэрыяламі, інструментамі, прыстасаваннямі, вучэбным абсталяваннем і спартыўным інвентаром у адпаведнасці з зацверджаным пералікам.

5. Настаўнікам-прадметнікам Адамчык А.А., Аніськевіч А.В., Бакунову В.С., Дубінец В.В., Засімовіч Л.Ю., Мароз Т.І., Пілясавай І.У., Саўко І.І., Саўко П.І., Трутневай Л.У.:

5.1. забяспечыць:

5.1.1. ацэньванне заданняў школьнай алімпіяды ў адпаведнасці з рэкамендацыямі аўтараў заданняў па іх рашэнні і ацэньванню, выпадкі істотнага змянення падыходаў да ацэньвання заданняў раённай

алімпіяды павінны быць узгоднены з прадметным аргкамітэтам раённай алімпіяды;

5.1.2. шырокае прадстаўніцтва вучняў на алімпіядах па ўсіх вучэбных прадметах;

5.2. прыняць да ведама тэрміны правядзення раённай алімпіяды (дадатак 4 да загаду ўпраўлення адукацыі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта ад 12 верасня 2025 г. № 302).

6. Педагогу-псіхолагу Тулубу А.У. з мэтай забеспячэння псіхолага-педагагічнага суправаджэння ўдзельнікаў першага этапу алімпіяды правесці:

6.1. да 19 верасня 2025 г. трэнінг псіхалагічнай падрыхтоўкі вучняў да ўдзелу ў алімпіядах “Праз церні – да зорак!”;

6.2. падчас алімпіяд індывідуальныя кансультацыі “Прыёмы зняцця псіхаэмацыйнай напругі”.

7. Кантроль за выкананнем загада ўскласці на намесніка дырэктара па асноўнай дзейнасці Мялешка С.В.

Дырэктар Н.І.Бакунова

З загадам азнаёмлены: А.А.Адамчык

А.В.Аніськевіч

В.С.Бакуноў

В.В.Дубінец

Л.Ю.Засімовіч

С.В.Мялешка

Т.І.Мароз

І.У.Пілясава

І.І.Саўко

П.І.Саўко

Л.У.Трутнева

А.У.Тулуб

ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад дырэктара дзяржаўнай установы адукацыі “Міжэвіцкая сярэдняя школа Слонімскага раёна”
15.09.2025 № 205

ПАЛАЖЭННЕ
аб першым этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах дзяржаўнай установы адукацыі «Міжэвіцкая сярэдняя школа Слонімскага раёна»

ГЛАВА 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Палажэнне аб першым этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах дзяржаўнай установы адукацыі «Міжэвіцкая сярэдняя школа Слонімскага раёна» (далей – Палажэнне) вызначае:

мэты і задачы першага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах (далей – першы этап алімпіяды);

парадак арганізацыі і правядзення першага этапу алімпіяды;

парадак падвядзення вынікаў першага этапу алімпіяды;

парадак фарміравання і падрыхтоўкі каманд для ўдзелу ў першым этапе алімпіяды;

фінансаванне першага этапа алімпіяды.

2. Першы этап алімпіяды праводзіцца з мэтай выяўлення і падтрымкі найбольш здольных, адораных вучняў дзяржаўнай установы адукацыі “Міжэвіцкая сярэдняя школа Слонімскага раёна” (далей – установа адукацыі).

3. Асноўнымі задачамі першага этапу алімпіяды з’яўляюцца:

павышэнне цікавасці вучняў да вывучаемых прадметаў, развіццё іх творчых здольнасцей, паглыбленне тэарэтычных ведаў і практычных уменняў, садзейнічанне самарэалізацыі асобы;

рэалізацыя ідэі бесперапыннай адукацыі шляхам падрыхтоўкі адоранай навучэнскай моладзі для прадаўжэння навучання ва ўстановах вышэйшай адукацыі;

стымуляванне дзейнасці педагагічнага калектыву па развіцці здольнасцей адораных вучняў;

актывізацыя работы факультатыўных заняткаў, аб’яднанняў па інтарэсах, іншых форм пазакласнай і пазашкольнай работы з вучнёўскай моладдзю;

прапаганда навуковых ведаў і развіццё цікавасці вучняў да навуковай дзейнасці;

падрыхтоўка вучняў да ўдзелу ў рэспубліканскіх алімпіядах.

4. Першы этап алімпіяды праводзіцца ва ўстанове адукацыі ў кожным навучальным годзе.

5. Першы этап алімпіяды праводзіцца па наступных вучэбных прадметах: беларуская мова і беларуская літаратура, руская мова і руская літаратура, англійская мова, нямецкая мова, матэматыка, фізіка, астраномія, інфарматыка, біялогія, хімія, геаграфія, гісторыя, грамадазнаўства, працоўнае навучанне, фізічная культура і здароўе.

На першым этапе алімпіяды пералік вучэбных прадметаў, па якіх праводзіцца алімпіяда, вызначае ўстанова адукацыі.

6. Для забеспячэння правядзення першага этапу алімпіяды прыцягваюцца педагогі ўстановы адукацыі.

## ГЛАВА 2
## ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ ПЕРШАГА ЭТАПУ АЛІМПІЯДЫ

7. Падрыхтоўку і правядзенне першага этапу алімпіяды забяспечвае ўстанова адукацыі.

8. Першы этап алімпіяды праводзіцца не пазней за кастрычнік бягучага навучальнага года. Канкрэтныя тэрміны правядзення першага этапу алімпіяды вызначаюцца ўпраўленнем адукацыі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта.

9. Месца правядзення першага этапу алімпіяды вызначаецца ўстановай адукацыі.

10. Першы этап алімпіяды з улікам спецыфікі навучальнага прадмета можа ўключаць наступныя туры: тэарэтычны, практычны, тэарэтыка-практычны.

11. Для падрыхтоўкі і правядзення першага этапу алімпіяды кіраўніком установы адукацыі ствараюцца арганізацыйныя камітэты (далей – аргкамітэты).

12. У склад аргкамітэтаў першага этапу алімпіяды ўключаюцца педагагічныя работнікі ўстановы адукацыі, могуць уключацца прадстаўнікі ўпраўлення адукацыі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта.

13. Аргкамітэты першага этапу алімпіяды:

распрацоўваюць і зацвярджаюць парадак правядзення першага этапу алімпіяды па кожным вучэбным прадмеце;

арганізуюць першы этап алімпіяды па адзіных тэкстах і ў адзіныя дні;

забяспечваюць тыражаванне, захоўванне алімпіядных заданняў і іх канфідэнцыяльнасць;

узнагароджваюць пераможцаў;

асвятляюць ход падрыхтоўкі, правядзення і вынікі першага этапу алімпіяды на сайце (інфармацыйным стэндзе) ўстановы адукацыі;

ажыццяўляюць аналіз вынікаў правядзення першага этапу алімпіяды і прадстаўляюць справаздачу ў аргкамітэт другога этапу згодна з загадам упраўлення адукацыі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта;

забяспечваюць правядзенне інструктыўнай нарады з членамі журы, удзельнікамі алімпіяды;

аналізуюць пратаколы і работы пераможцаў першага этапу алімпіяды;

фарміруюць каманды для ўдзелу ў другім этапе рэспубліканскай алімпіяды з ліку пераможцаў, якія набралі найбольшую колькасць балаў на першым этапе рэспубліканскай алімпіяды, у адпаведнасці з дадзеным Палажэннем, Палажэннем аб 1-2 этапах рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах вучняў устаноў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, зацверджаным загадам начальніка ўпраўлення адукацыі Слонімскага райвыканкама.

14. Для падвядзення вынікаў асабістага першынства на першым этапе алімпіяды ствараецца журы з ліку педагагічных работнікаў установы. Журы ўзначальвае старшыня.

15. Колькасны склад журы ўстанаўліваецца ад 3 да 5 чалавек у залежнасці ад спецыфікі вучэбнага прадмета, па якім праводзіцца алімпіяда.

16. Журы першага этапу алімпіяды:

правярае і ацэньвае выкананне алімпіядных заданняў па кожным туры;

інфармуе ўдзельнікаў аб выніках кожнага тура па вучэбным прадмеце;

разглядае звароты ўдзельнікаў па пытаннях, якія ўзніклі ў іх па выніках ацэньвання выкананых імі алімпіядных заданняў пасля завяршэння ўсіх тураў першага этапу алімпіяды па кожным прадмеце;

інфармуе ўдзельнікаў аб выніках іх удзелу ў першым этапе алімпіяды;

вызначае пераможцаў першага этапа алімпіяды;

уносіць прапановы ў аргкамітэт першага этапа алімпіяды па ўзнагароджанні ўдзельнікаў;

афармляе выніковую дакументацыю.

17. Рашэнні журы першага этапу алімпіяды прымаюцца на іх пасяджэннях і афармляюцца пратаколамі. Журы правамоцна прымаць рашэнне, калі на пасяджэнні прысутнічае не менш як 2/3 зацверджанага складу журы. Рашэнне лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала больш за палову прысутных на пасяджэнні членаў журы.

18. Звароты ўдзельнікаў па пытаннях ацэньвання выкананых імі алімпіядных заданняў накіроўваюцца ў журы і разглядаюцца ім пасля завяршэння апошняга тура першага этапу алімпіяды, аб’яўлення вынікаў усіх тураў, азнаямлення ўдзельнікаў алімпіяды з рашэннямі заданняў.

19. Пасля заканчэння першага этапу алімпіяды журы перадаюць у аргкамітэт свае рашэнні, спісы ўдзельнікаў, выкананыя ўдзельнікамі алімпіядныя заданні.

## ГЛАВА 3
## УДЗЕЛЬНІКІ ПЕРШАГА ЭТАПУ АЛІМПІЯДЫ

20. У першым этапе алімпіяды прымаюць удзел усе жадаючыя вучні ўстановы адукацыі.

21. Для ўдзелу пераможцаў першага этапу алімпіяды ў другім этапе алімпіяды загадам кіраўніка ўстановы адукацыі назначаецца настаўнік, які суправаджае вучняў на другі этап алімпіяды.

## ГЛАВА 4
## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ ПЕРШАГА ЭТАПУ АЛІМПІЯДЫ

22. На першым этапе алімпіяды журы вызначае пераможцаў з ліку ўдзельнікаў дадзенага этапу рэспубліканскай алімпіяды.

23. Пераможцам вызначаецца ўдзельнік, які набраў у агульнай колькасці балаў 50 і больш працэнтаў ад устаноўленай магчымай максімальнай колькасці.

У выпадку адсутнасці пераможцаў, якія набралі 50 і больш працэнтаў  ад агульнай колькасці балаў, пераможцам на ўзроўні

ўстановы адукацыі прызнаецца вучань, які набраў не менш, чым 40% ад устаноўленай максімальнай колькасці балаў.

24. Пераможцы першага этапу алімпіяды ўзнагароджваюцца дыпломамі І, ІІ і ІІІ ступеней.

Колькасць дыпломаў І, ІІ і ІІІ ступеняў алімпіяды вызначаецца журы І этапу алімпіяды зыходзячы з наступнай прапорцыі: не больш за 50% ад колькасці пераможцаў узнагароджваюцца дыпломамі ІІІ ступені, не больш за 30% – дыпломамі ІІ ступені, не больш за 20% – дыпломамі І ступені.

Удзельнікі, прызнаныя пераможцамі згодна з абзацам 2 пункта 23, ўзнагароджваюцца дыпломамі ІІІ ступені.

25. Устаноўленая ў адпаведнасці з пунктам 23 гэтага Палажэння колькасць пераможцаў можа быць павялічана па рашэнні журы ў выпадку, калі некалькі ўдзельнікаў набралі аднолькавую колькасць балаў, якая адпавядае ніжэйшаму ўзроўню, неабходнаму для вызначэння прызавых месцаў.

## ГЛАВА 5
## ПАРАДАК ПАДРЫХТОЎКІ, ЗАХОЎВАННЯ І ДАСТАЎКІ АЛІМПІЯДНЫХ ЗАДАННЯЎ ДЛЯ ПЕРШАГА ЭТАПУ АЛІМПІЯДЫ

26. Алімпіядныя заданні для першага этапу алімпіяды па кожным вучэбным прадмеце:

распрацоўваюцца саставамі распрацоўшчыкаў, якія зацверджаны аргкамітэтамі трэцяга этапу алімпіяды;

зацвярджаюцца старшынёй абласнога аргкамітэта не пазней, чым за два дні да пачатку першага этапу алімпіяды;

прадстаўляюцца кіраўніку ўстановы адукацыі па электроннай пошце (пад паролем) не пазней, чым за 2 дні да пачатку першага этапу алімпіяды;

тыражуюцца адказнай асобай першага этапу алімпіяды ў прысутнасці кіраўніка ўстановы адукацыі;

раскладваюцца ў канверты ў адпаведнасці з рассадкай удзельнікаў па кабінетах установы адукацыі, а таксама для членаў журы па кожным вучэбным прадмеце;

захоўваюцца ў сейфе ўстановы адукацыі;

ускрываюцца членамі аргкамітэта першага этапу алімпіяды ў прысутнасці ўдзельнікаў па кожным вучэбным прадмеце.

## ГЛАВА 6
## ФІНАНСАВАННЕ ПЕРШАГА ЭТАПУ АЛІМПІЯДЫ

27. Фінансаванне першага этапу алімпіяды ажыццяўляецца ўстановай адукацыі.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад дырэктара дзяржаўнай установы адукацыі

“Міжэвіцкая

сярэдняя школа Слонімскага раёна”

15.09.2025 № 205

СКЛАД

арганізацыйных камітэтаў першага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах дзяржаўнай установы адукацыі “Міжэвіцкая сярэдняя школа Слонімскага раёна”

| Вучэбны прадмет | Старшыня, пасада | Члены арганізацыйнага камітэта | |
|---|---|---|---|
| | | Прозвішча, імя, імя па бацьку | Пасада |
| Англійская мова Нямецкая мова | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Мароз Т.І. | Настаўнік геаграфіі |
| | | Мандрык А.М. | Настаўнік рускай мовы і літаратуры |
| Беларуская мова і літаратура | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Дубінец В.В. | Настаўнік англійскай і нямецкай мовы |
| | | Мароз Т.І. | Настаўнік геаграфіі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Матэматыка | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Трутнева Л.У. | Настаўнік беларускай мовы і літаратуры |
| | | Мандрыкевіч З.П. | Настаўнік пачатковых класаў |
| Астраномія | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Мандрык А.М. | Настаўнік рускай мовы і літаратуры |
| | | Мандрыкевіч З.П. | Настаўнік пачатковых класаў |
| Біялогія | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Засімовіч Л.Ю. | Настаўнік гісторыіі |
| | | Дубінец В.В. | Настаўнік англійскай і нямецкай мовы |
| Гісторыя | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Тулуб А.У. | Педагог-псіхолаг |
| | | Саўко І.І. | Настаўнік біялогіі |
| Геаграфія | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Засімовіч Л.Ю. | Настаўнік гісторыіі |
| | | Трутнева Л.У. | Настаўнік беларускай мовы і літаратуры |
| Руская мова і літаратура | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Тулуб А.У. | Педагог-псіхолаг |
| | | Мандрыкевіч З.П. | Настаўнік пачатковых класаў |
| Хімія | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Засімовіч Л.Ю. | Настаўнік гісторыіі |
| | | Дубінец В.В. | Настаўнік англійскай і нямецкай мовы |
| Грамадазнаўства | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Тулуб А.У. | Педагог-псіхолаг |
| | | Саўко І.І. | Настаўнік біялогіі |
| Фізіка | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Засімовіч Л.Ю. | Настаўнік гісторыіі |
| | | Трутнева Л.У. | Настаўнік беларускай мовы і літаратуры |
| Фізічная культура і здароўе | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Тулуб А.У. | Педагог-псіхолаг |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Мароз Т.І. | Настаўнік геаграфіі |
| Працоўнае навучанне | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Саўко І.І. | Настаўнік біялогіі |
| | | Засімовіч Л.Ю. | Настаўнік гісторыіі |

ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад дырэктара дзяржаўнай установы адукацыі “Міжэвіцкая сярэдняя школа Слонімскага раёна”
15.09.2025 № 205

СКЛАД
прадметных журы першага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах дзяржаўнай установы адукацыі “Міжэвіцкая сярэдняя школа Слонімскага раёна”

| Вучэбны прадмет | Старшыня, пасада | Члены журы | |
|---|---|---|---|
| | | Прозвішча, імя, імя па бацьку | Пасада |
| Англійская мова Нямецкая мова | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Адамчык А.А. | Настаўнік англійскай мовы |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Дубінец В.В. | Настаўнік англійскай і нямецкай мовы |
| Беларуская мова і літаратура | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Мандрык А.М. | Настаўнік рускай мовы і літаратуры |
| | | Трутнева Л.У. | Настаўнік беларускай мовы і літаратуры |
| Матэматыка | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Бакуноў В.С. | Настаўнік фізікі |
| | | Пілясава І.У. | Настаўнік матэматыкі |
| Астраномія | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Бакуноў В.С. | Настаўнік фізікі |
| | | Пілясава І.У. | Настаўнік матэматыкі |
| Біялогія | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Мароз Т.І. | Настаўнік геаграфіі |
| | | Саўко І.І. | Настаўнік біялогіі |
| Гісторыя | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Засімовіч Л.Ю. | Настаўнік гісторыіі |
| | | Мароз Т.І. | Настаўнік геаграфіі |
| Геаграфія | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Засімовіч Л.Ю. | Настаўнік гісторыіі |
| | | Мароз Т.І. | Настаўнік геаграфіі |
| Руская мова і літаратура | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Аніськевіч А.В. | Настаўнік рускай мовы і літаратуры |
| | | Мандрык А.М. | Настаўнік рускай мовы і літаратуры |
| Хімія | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Мароз Т.І. | Настаўнік геаграфіі |
| | | Саўко І.І. | Настаўнік біялогіі |
| Грамадазнаўства | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Засімовіч Л.Ю. | Настаўнік гісторыіі |
| | | Мароз Т.І. | Настаўнік геаграфіі |
| Фізіка | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Бакуноў В.С. | Настаўнік фізікі |
| | | Пілясава І.У. | Настаўнік матэматыкі |
| Фізічная культура і здароўе | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Варона Ж.С. | Настаўнік пачатковых класаў |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Саўко П.І. | Настаўнік фізічнай культуры і здароўя |
| Працоўнае навучанне | Мялешка С.В., нам.дырэктара па АД | Бакуноў В.С. | Настаўнік працоўнага навучання |
| | | Мандрыкевіч З.П. | Настаўнік пачатковых класаў |

ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад дырэктара дзяржаўнай установы адукацыі

“Міжэвіцкая

сярэдняя школа Слонімскага раёна”

15.09.2025 № 205

СПІС

удзельнікаў першага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах дзяржаўнай установы адукацыі “Міжэвіцкая сярэдняя школа Слонімскага раёна”

| Вучэбны прадмет | Клас | Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка |
|---|---|---|
| Англійская мова | 10 | Шчыракова Паліна Ігараўна |
| | 11 | Нагель Дар'я Генадзьеўна |
| Нямецкая мова | 11 | Галенка Алеся Аляксандраўна |
| Беларуская мова і літаратура | 9 | Талалай Анастасія Яўгеньеўна |
| | 10 | Шчыракова Паліна Ігараўна |
| | 11 | Нагель Дар'я Генадзьеўна |
| | 11 | Леванюк Кацярына Расціславаўна |
| Матэматыка | 8 | Лысковец Дзмітрый Аляксандравіч |
| | 9 | Палешак Аляксей Міхайлавіч |
| | 9 | Карповіч Вадзім Вітальевіч |
| | 9 | Ветчынкін Арсеній Дзмітрыевіч |
| | 10 | Пузыновіч Яўгеній Віктаравіч |
| | 10 | Шчыракова Паліна Ігараўна |
| | 11 | Нагель Дар'я Генадзьеўна |
| | 11 | Леванюк Кацярына Расціславаўна |
| Астраномія | 11 | Нагель Дар'я Генадзьеўна |
| | 11 | Леванюк Кацярына Расціславаўна |
| Біялогія | 9 | Карповіч Вадзім Вітальевіч |
| | 9 | Старкоў Ілья Аляксандравіч |
| | 10 | Пузыновіч Яўгеній Віктаравіч |
| | 10 | Цэцэравас Арцём Сяргеевіч |
| | 11 | Нагель Дар'я Генадзьеўна |
| | 11 | Леванюк Кацярына Расціславаўна |
| Гісторыя | 10 | Пузыновіч Яўгеній Віктаравіч |
| | 10 | Шчыракова Паліна Ігараўна |
| | 11 | Нагель Дар'я Генадзьеўна |
| | 11 | Леванюк Кацярына Расціславаўна |
| Геаграфія | 9 | Палешак Аляксей Міхайлавіч |
| | 9 | Карповіч Вадзім Вітальевіч |
| | 10 | Пузыновіч Яўгеній Віктаравіч |
| | 10 | Цэцэравас Арцём Сяргеевіч |
| | 11 | Нагель Дар'я Генадзьеўна |
| | 11 | Леванюк Кацярына Расціславаўна |
| Руская мова і літаратура | 9 | Талалай Анастасія Яўгеньеўна |
| | 10 | Шчыракова Паліна Ігараўна |
| | 11 | Грыцэвіч Ульяна Андрэеўна |
| Хімія | 9 | Карповіч Вадзім Вітальевіч |
| | 9 | Палешак Аляксей Міхайлавіч |
| | 10 | Пузыновіч Яўгеній Віктаравіч |
| | 10 | Цэцэравас Арцём Сяргеевіч |
| | 11 | Нагель Дар'я Генадзьеўна |
| | 11 | Леванюк Кацярына Расціславаўна |
| Грамадазнаўства | 10 | Шчыракова Паліна Ігараўна |
| | 10 | Мышко Дар'я Віктараўна |
| | 11 | Нагель Дар'я Генадзьеўна |

| | | |
|---|---|---|
| | 11 | Леванюк Кацярына Расціславаўна |
| Фізіка | 9 | Ветчынкін Арсеній Дзмітрыевіч |
| | 9 | Карповіч Вадзім Вітальевіч |
| | 10 | Шчыракова Паліна Ігараўна |
| | 11 | Нагель Дар’я Генадзьеўна |
| | 11 | Леванюк Кацярына Расціславаўна |
| Фізічная культура і здароўе | 6 | Максімаў Дзяніс Дзмітрыевіч |
| | 7 | Раманчук Мікіта Мікалаевіч |
| | 8 | Лысковец Дзмітрый Аляксандравіч |
| | 9 | Карповіч Вадзім Вітальевіч |
| | 10 | Пузыновіч Яўгеній Віктаравіч |
| | 11 | Галенка Алеся Аляксандраўна |
| Працоўнае навучанне | 8 | Лысковец Дзмітрый Аляксандравіч |
| | 9 | Карповіч Вадзім Вітальевіч |
| | 9 | Палешак Аляксей Міхайлавіч |
| | 9 | Ветчынкін Арсеній Дзмітрыевіч |
| | 10 | Пузыновіч Яўгеній Віктаравіч |

Дадатак 1

да загада дырэктара дзяржаўнай установы адукацыі “Міжэвіцкая сярэдняя школа Слонімскага раёна”
15.09.2025 № 205

ГРАФІК
правядзення першага (школьнага) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах

| Вучэбны прадмет | Дата правядзення | Час правядзення | Назва тура | Класы | Кабінет |
|---|---|---|---|---|---|
| Англійская мова Нямецкая мова | 30.09.2025 | 10.00 – 12.00 | пісьмовая работа | 10 – 11 | 6 |
| Беларуская мова і літаратура | 01.10.2025 | 10.00 – 12.00 | комплексная работа | 9 – 11 | 6 |
| Матэматыка | 02.10.2025 | 10.00 – 13.00 | тэарэтычны | 8 – 11 | 6 |
| Астраномія | 04.10.2025 | 10.00 – 12.00 | тэарэтыка-практычны | 5 – 11 | 6 |
| Біялогія | 06.10.2025 | 10.00 – 12.00 | тэарэтыка-практычны | 9 – 11 | 6 |
| Гісторыя | 07.10.2025 | 10.00 – 12.30 | тэарэтычны | 10 – 11 | 6 |
| Геаграфія | 08.10.2025 | 10.00 – 12.30 | тэарэтыка-практычны | 9 – 11 | 6 |
| Руская мова і літаратура | 09.10.2025 | 10.00 – 12.00 | комплексная работа | 9 – 11 | 6 |
| Хімія | 13.10.2025 | 10.00 – 12.30 | тэарэтыка-практычны | 9 – 11 | 6 |
| Грамадазнаўства | 14.10.2025 | 10.00 – 12.30 | тэарэтычны | 10 – 11 | 6 |
| Фізіка | 15.10.2025 | 10.00 – 12.00 | тэарэтычны | 9 – 11 | 6 |
| Фізічная культура і здароўе | 16.10.2025 | 10.00 – 11.00 | тэарэтычны | 5 – 11 | 6 |
| | | вызначае аргкамітэт другога этапу рэспубліканскай алімпіяды | плаванне гульнявыя віды спорту тэсціраванне | | спартыўная зала |
| Працоўнае навучанне | 17.10.2025 | 10.00 – 10.30 | тэарэтычны | 5 – 11 | 6 |
| | | 11.00 – 13.00 | практычны | | майстэрня |